Бясконцы хлеб

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
15.11.2015 01:00



Прывітанне, Маленькі Сябар! Спадзяёмся, Табе спадабалася шукаць сэнс у простай, на першы погляд, прыпавесці. Упэўнены, да нашчупвання сутнасці далучаліся Твае бацькі і сябры. Бо не так і проста распазнаць, што тоіцца за займальным сюжэтам і ўчынкамі герояў. Але, прыклаўшы некаторыя намаганні і адказаўшы на пытанні пасля прачытання прыпавесці, Ты здабываеш зерне мудрасці. Яно будзе наспяваць у Тваёй душы і праз некаторы час дасць добры плён. Можаш не сумнявацца, у патрэбны час яно закаласіцца прыгожай рунню. Сёння прапануем Табе паразважаць над прыпавесцю пра тое, як у добрай бабулькі не пераводзіўся хлеб.

Жыла-была бедная старая. Такая яна была бедная, што часам ёй нават не было з чаго хлеба спячы.

І была ў яе суседка, якая гэтую бабульку няспынна беднасцю дакарала.

Ды аднойчы заўважыла суседка: як толькі яна збіраецца хлеб пячы, у бабулькі таксама з трубы дым ідзе, быццам хлеб пячэцца.

– Няўжо гэтая жабрачка разбагацела? – дзівілася суседка.

– Трэба было б зазірнуць да яе, праверыць.

Заходзіць яна да бабулькі, а тая сапраўды каравай з печы вымае.

Пасадзіла суседку за стол, хлебам свежым частуе.

– Адкуль жа ў цябе хлеб? – пытаецца суседка.

– Нядаўна была бядней беднага, а цяпер кожны дзень хлеб пячэш? † І расказала ёй старая, што стамілася яна ад папрокаў у беднасці. І каб сорамна не было, стала галавешку, што дымілася, у печ падкладваць, калі суседка прымалася хлеб пячы. Тыдзень так праходзіць, другі, вось бабулька і прыдумала: “А дай-ка я буду Бога аб літасці прасіць кожны раз, як галавешку ў печку кладу”.

Так і пачала рабіць. Кладзе галавешку ў печ і моліцца. Раптам нехта стукае ў акенца. Глядзіць бабулька – стаіць стары жабрак у лахманах, хлеба просіць. А хлебца ў доме ні кавалка. Аддала яна незнаёмаму апошнюю сваю бульбіну.

Той яе з’еў і зноў хлеба просіць.

– Адкуль жа я табе, дзядуля, хлеба вазьму? – пытаецца бабуля.

– А ты з печы дастань, – адказвае дзядок.

Зазірнула бабулька ў печ, а там і сапраўды гатовы каравай ляжыць.

Войкнула яна, дастала яго і стала дзядка карміць. Ён з’еў увесь каравай і яшчэ просіць.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
15.11.2015 01:00

– Няма ў мяне больш хлеба, – кажа бабуля.

– А ты зноў з печы дастань, – кажа дзядок.

Глядзіць бабуля – а там зноў каравай ляжыць. Дастае яго з печы, а сама ўслых дзівіцца:

– Да якога ж часу Бог хлеб мне будзе дараваць?

– А да таго часу, пакуль з чыстым сэрцам будзеш дзяліцца з усімі галоднымі, – адказаў стары.

Вось з таго часу і не пераводзіцца ніколі ў хаце ў добрай бабулькі хлеб.

- **Якім чынам бабуля хацела вырашыць сваю праблему?**
- **Хто пастукаўся да яе ў дзверы?**
- **Чым старая пачаставала госця?**
- **Хто падкладваў караваі ў печ?**
- **Наколькі шчодры Бог?**